**Лагвіненка С.М., Півавар М.В.**

# ВЫХАВАННЕ ПАТРЫЯТЫЗМУ Ў ВУЧНЯЎ ВІЦЕБСКАГА КАДЭЦКАГА ВУЧЫЛІШЧА НА АСНОВЕ ПАМЯЦІ ПРА ПАДЗЕІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

Патрыятызм – маральны і палітычны прынцып, сацыяльнае пачуццё, асноўным зместам якога з'яўляецца любоў да Айчыны і гатоўнасць падпарадкаваць яму свае ўласныя інтарэсы. Патрыятызм прадугледжвае гонар за дасягненні гісторыі і культуры сваёй Радзімы, жаданне захоўваць яе характар і культурныя асаблівасці і ідэнтыфікацыя сябе з іншымі членамі народа, імкненне абараняць інтарэсы Радзімы і свайго народа. Важнейшай мэтай і вынікам патрыятычнага выхавання моладзі з'яўляецца праяўленне любові да Радзімы, Айчыны, Бацькаўшчыны. Задача любой сістэмы адукацыі – выхаванне ў моладзі грамадзянскіх якасцяў і, у першую чаргу менавіта патрыятызму. Ад ступені зфарміраванасці патрыятычных ідэалаў залежаць іншыя складаючыя сталай асобы: дысцыплінаванасць, лаяльнасць ураду, стойкасць, вытрымка, гатоўнасць да ахвярнасці і самаахвярнасці і іншыя. Гэтыя і шэраг іншых рыс асобы асабліва важны пры выхаванні моладзі, якая звязвае сваё жыццё з службай ў сілавых структурах нашай дзяржавы. Афіцэр, міліцыянер, супрацоўнік Міністэрства надзвычайных сітуацый, пракурорскі работнік павінны мець значна большы запас трываласці з той прычыны, што служба вымагае ад чалавека выпрабавання прынцыпаў і сілы волі больш, чым у прадстаўнікоў іншых прафесій. Таму, асаблівую важнасць мае выхаванне ў навучэнцаў кадэцкіх вучылішч патрыятычных якасцяў.

Выкарыстанне ў выхаваўчым працэсе прыкладаў гераізму, патрыятызму, мужнасці беларускага народу ў розных войнах вельмі актуальная і значная задача. Факталагічнага матэрыялу хапае. Ад часоў Полацкага княства да вайны ў Афганістане беларусы ўдзельнічалі ў сотнях ваенных канфліктаў. Вялікая Айчынная вайна, – апошняя з выпрабаванняў нашага народу прынесла незлічоныя беды і страты нашай краіне. Пры гэтым, менавіта на гэтай вайне праяўляліся найлепшыя якасці савецкага чалавека, сярод якіх патрыятызм мае найважнейшае месца. Спынімся на некаторых мерапрыемствах, якія праводзяцца ў Віцебскім кадэцкім вучылішчы (далей ВКВ), на аснове якіх выхаванне патрыятызму робіцца на аснове падзей Вялікай Айчыннай вайны [1].

Пачнем з таго, што ў вучылішчы выкладаецца спецкурс "Вялікая Айчынная вайна ў кантэксце Другой сусветнай вайны". Ён праводзіцца ў другім паўгоддзі ў 10 класе за кошт гадзін, выдадкаваных на вывучэнне Другой сусветнай вайны ў курсах сусветнай гісторыі і гісторыі Беларусі.

У адпаведнасці з каляндарным планам выхаваўчых мерапрыемстваў у ВКВ праводзяцца: тэматычная вечарына "Ганаруся табою, Беларусь", "Маладосць, абпаленая вайной", тэматычная вечарына "Юнгі Вялікай Айчыннай вайны". У кожную першую суботу месяца праводзіцца цыкл сустрэч "Круглая дата", шэраг з якіх звязаны з юбілейнымі датамі з гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. У лютым праводзіцца "Дзень юнага героя-антыфашыста". Па нядзелях у бібліятэцы адбываецца паказ мастацкіх фільмаў, у ліку якіх значную частку складаюць фільмы, прысвечаныя падзеям вайны.

У лютым традыцыйна праводзіцца месячнік "Служу Айчыне". Ён уключае цэлы комплекс мерапрыемстваў, шэраг якіх звязаны з Вялікай Айчыннай вайной. Вось некаторыя мерапрыемствы, што заснаваны на ваеннай тэматыцы:



Репозиторий ВГУ

- Завочныя экскурсіі “Яны праславілі наш горад, нашу вёску”;
- Аперацыя “Абеліск”;
- Аперацыя “Да нас прыйшоў ветэран”;
- Фестываль інсцэніраванай патрыятычнай песні, прысвечаны Дню абаронцы Айчыны і Узброеным Сілам Рэспублікі Беларусь “Памяць сэрца”;
- Канцэртная праграма “Айчыны верныя сыны”;
- Тэматычная гульня “Каб памяталі”, прысвечаная памятным датам з гісторыі Лужасна;
- Паспрачаемся з вялікім “Крылатыя словы палкаводцаў”;
- Канферэнцыя чытачоў “Іх імёнамі названы вуліцы горада Віцебска”;
- Стэндавая газета “Ваенная гісторыя Айчыны”;
- Дэбаты на тэму “Ёсць такая прафесія: Радзіму абараняць ці славу шукаць?” і іншыя [2].

Важнай часткай комплексу мерапрыемстваў з’яўляецца ўдзел кадэт у гарадскім ганаровым сходзе і праходжанні ганаровым маршам каля мемарыяльнага комплексу “Вызваліцелям Віцебска”, прысвечанага савецкім воінам, партызанам і падпольшчыкам, а таксама мітынг-рэквіем каля помніка Невядомаму салдату ў г.п. Руба, помніка Герою Савецкага Саюза Міхаілу Сільніцкаму на чыгуначнай станцыі Лужасна і помніку на месцы загубы савецкіх ваеннапалонных і мірных грамадзян у 1941–1944 гг. у в. Лужасна.

21 сакавіка за 10 хвілін да ўрока у кожным класе праводзіцца мітынг-памяць “Хатынскі рэквіем”, які прысвячаецца беларускім вёскам, якія былі спалены разам з людзьмі фашысцкімі захопнікамі.

Да дня Перамогі таксама прымеркаваны святочныя мерапрыемствы: канцэрты, урачыстыя пасяджэнні, спартыўныя конкурсы, канферэнцыі і інш. Да помнікаў, якія знаходзяцца непадалёк ад Лужасна ўскладаюцца кветкі, вянкі, гірлянды, арганізуюцца ганаровыя вахты. На працягу года праводзяцца тэматычныя лекцыі, прысвечаныя круглым датам: вызваленню Беларусі, пачатку Вялікай Айчыннай вайны, буйнейшым аперацыям вайны (Сталінградскай, Маскоўскай, Курскай і інш.).

Значная частка выхаваўчай працы ў вучылішчы звязана з працай турысцка-экалагічна-краязнаўчага клуба “Дзвіна”, які дзейнічае ў ВКВ. Асноўнымі накірункамі дзейнасці яго з’яўляюцца турыстычны і краязнаўчы. Сярод форм дзейнасці турыстычнага накірунку ў першую чаргу вылучым экскурсіі, паходы, паездкі, экспедыцыі. Значнае месца займае тэма мінулай вайны ў навукова-даследчай працы навучэнцаў (праведзенне даследаванняў па пэўных тэмах; падрыхтоўка выступленняў і ўдзел у канферэнцыях і семінарах рознага ўзроўню, прэзентацыях). Значнай формай працы з’яўляецца публіцыстычная і эдыцыйная дзейнасць: падрыхтоўка, праўка, рэдактура, карэктура, выданне артыкулаў, буклетаў. Не кранаючы ўсіх тэм, якімі займаюцца кадэты – удзельнікі клуба і кадэты, якія бяруць удзел у мерапрыемствах, спынімся на тэматыцы Вялікай Айчыннай вайны.

На працягу навучальнага года штонядзелю праводзяцца паходы нядзельнага адпачынку. Некаторыя маюць вузка гісторыка-культурную ці прыродную накіраванасць, але большая частка носіць комплексны характар. Кожны з паходаў праходзіць па месцах былых баёў ці падзей, нейкім чынам звязаных з Вялікай Айчыннай вайной. Выкладчыкі з кадэтамі робяць аўтобусныя экскурсіі па Віцебскай вобласці. Асноўнымі аб’ектамі ўвагі з’яўляюцца: мемарыял “Прарыў” (в. Паперына, Ушацкі раён); мемарыяльны комплекс “Кацюша” (г. Орша); мемарыяльны комплекс “Праклён фашызму” (в. Шунеўка, Докшыцкі раён); партызанскі аэрадром ў г.п. Бегомль; помнік “Віцебскія вароты” (в. Заполле, Віцебскі раён); магіла 8 Герояў Савецкага Саюза (в. Узрэчча, Бешанковіцкі раён); мемарыяльны комплекс і помнік воінам-танкістам ІСУ-152 (в. Мішневічы, Шумілінскі раён); мемарыяльны комплекс у в. Рыленкі Дубровенскага раёна; помнікі Полацка (помнік 23 воінам-гвардзейцам, помнік камсамольцам Полацка, курган Бессмяротнасці, помнік памяці войскаў 1-га Прыбалтыйскага фронту (Т-34), помнік “Вызваліцелям Полацка”, памятны знак ахвярам фашызму ва ўрочышчы Пяскі); на філіял полацкага музея баявой славы “Поле ратнай славы”; ДОТы на “Лініі Сталіна” (каля г.п. Ветрына Полацкага раён); помнік вызваліцелям і танк ІС-2 (г. Гарадок) і ў іншыя месцы.

Як форма краязнаўчай працы ў вучылішчы практыкуюцца паходы да цікавых месцаў нашага раёну і наваколляў Віцебска: на мемарыяльныя комплексы ў в. Арлова, Вароны, Копці, Заронава, Старае Сяло, Шапуры, на вышыню 222,2, з якой пачыналася вызваленне Віцебска, да

Рэпазіторый ВДУ

в. Гняздзілава, дзе была завяршылася акружэнне нямецкіх войскаў пад Віцебскам, у г.п. Багушэўск, дзе адбывалася самае вялікае танкавае сражэнне Другой сусветнай вайны, па месцах баявых дзеянняў 1-й Віцебскай партызанскай брыгады (вв. Мазалава, Сакольнікі, Сушчова), да месца пераходу 825 волга-татарскага батальёна “Ідэль-Урал” на бок партызан (Руба, Аўдзеевічы, Гралёва) і іншыя [3].

Для знаёмства з ваеннай гісторыяй Віцебска распрацаваны некалькі экскурсій. Удзельнікі клуба і іншыя кадэты па магчымасці павінны наведаць: мемарыяльны комплекс у гонар савецкіх воінаў-вызваліцеляў, партызан і падпольшчыкаў Віцебшчыны (Плошча Перамогі), помнік Герою Савецкага Саюза А.К. Гараўцу (вул. Гараўца), помнік героям віцебскага падполля (вул. 1-я Чырвонабрыгадная), помнік Герою Савецкага Саюза М.П. Шмырову (вул. Чэхава, 4), помнік М. Шмырову (вул. Шмырова), помнік Герою Савецкага Саюза В.З. Харужай (Маскоўскі пр-т, каля СШ № 31), абеліск на месцы канцлагера 5-ы полк (вул. Цітова), помнікі каля ВДУ імя П.М. Машэрава, памятны знак на месцы пакарання савецкіх патрыётаў ў гады Вялікай Айчыннай вайны (вул. Леніна, 36), помнік “Дзецям вайны” (парк партызанскай славы імя М. Шмырова) і іншыя.

На аснове сабраных у паходах матэрыялаў з кадэтамі праводзіцца значная навуковая-даследчая праца. Напрыклад, на працягу некалькіх гадоў былі выяўлены некаторыя факты неадпавядання помнікаў апошняй вайне і статуса гісторыка-культурных каштоўнасцяў. Была падрыхтавана навукова-даследчая работа “Праблемы аховы помнікаў, прысвечаных Вялікай Айчыннай вайне на тэрыторыі Віцебска раёна”, у якой раскрывалася складаная праблема, прапаноўваліся магчымыя шляхі паляпшэння сітуацыі, рабіліся рэкамендацыі. На навукова-практычнай канферэнцыі навучэнцаў устаноў адукацыі Віцебскай вобласці “Эўрыка”, а таксама на І Рэспубліканскім конкурсе даследчых работ (канферэнцыі) навучэнцаў работа была адзначана дыпломам ІІ ступені.

Удзельнікамі клуба “Дзвіна” праведзена даследчая работа па вывучэнні патэнцыялу дзяржаўных, ведамасных і школьных музеяў горада. Складзены спіс у адпаведнасці з якім кожны клас (узвод) выбірае для наведвання адзін ці некалькі музеяў ці экспазіцый [4]. Кадэты аказалі значную дапамогу ў падрыхтоўцы да выдання рукапісу кнігі А.А. Ганчарова, (вычытка, набор, вёрстка) “1-я Віцебская партызанская брыгада”. Для ўдакладнення некаторых фактаў, добраўпарадкавання помнікаў, апытання сведкаў, стварэння графічнага раду кнігі былі праведзены паходы на месцы баявых дзеянняў партызанскай брыгады, атрадаў, якія ўваходзілі ў яе склад. Галоўны акцэнт у правядзенні такіх паходаў і мерапрыемстваў робіцца не толькі на дапамогу ветэранам, але на выхаванне патрыятычных якасцяў у навучэнцаў усім спектрам педагагічных магчымасцяў.

Такім чынам, у Віцебскім кадэцкім вучылішчы праводзіцца значная праца па выхаванні ў навучэнцаў патрыятызму і грамадзянскіх якасцяў. Вялікая колькасць мерапрыемстваў праводзіцца на аснове ведаў і фактаў пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Такая тэматыка ў выхаваўчай працы садзейнічае лепшаму фарміраванню запатрабаваных сучасным грамадствам і дзяржавай якасцяў патрыёта і грамадзяніна, перадачы гістарычнай памяці, прывіццю любові да Радзімы, разуменню кошту вялікай Перамогі і недапушчэнню вайны як вырашэння палітычных праблем.

Літаратура

1. Півавар, М.В. Месца краязнаўства ў ідэалогіі Беларусі, Расіі і Украіны / М.В. Півавар // Краязнаўчая газета. – 2004. – Ліпень. – № 25 (42). – С. 4–5.
2. План проведения месячника «Служу Отечеству» 2013 – 2014 учебный год // Бягучы архіў Віцебскага кадэцкага вучылішча.
3. Півавар, М.В. Турысцка-краязнаўчыя рэсурсы наваколляў Віцебска (на прыкладзе Віцебскага раёна) / М.В. Півавар // Проблемы устойчивого развития регионов Республики Беларусь и сопредельных стран: сборник научных статей Второй Международной научно-практической конференции, 27–29 марта 2012 г., МГУ имени А.А. Кулешова, г. Могилев: в 2 ч / под ред. И.Н. Шарухо, И.И. Пирожника, И.И. Бариновой. – Могилев: УО «МГУ имени А.А. Кулешова», 2012. – Ч. 2. – С. 60–64.
4. Півавар, М.В. Выкарыстанне музеяў Віцебскага раёна ў навучальна-выхаваўчым працэсе / М.В. Півавар // Бюллетень учебно-консультационного центра «Витебский государственный университет имени П.М. Машерова – учреждения образования Витебского района. – 2013. – № 1. – С. 25–31.

Репозиторий ВГУ